# Маладосць



## 1980–я

### Паміж вусцішшу і шчасцем

**Святлана Курганава**

Тэма стасункаў з бацькамі рэалізуецца тонка і прыгожа, груба і амаль нечытэльна.

Некальким пісьменнікам (Быкаў, Адамчык, Разанаў і яшчэ) не па сілах апраўдаць існаванне цэлай сучаснай літаратуры.

Гэта была гісторыя маленькіх і вялікіх перамог, калі атрымлівалася надрукаваць тое, што друкаваць было нельга.

Я пакідаю на гэтых старонках нататкі, якія рабіліся на працягу працы над стосамі са 120 часопісаў. Ці заўважыце замілаванне 1980–мі? Яно з'явілася за той час, пакуль я пасталела на дзесяцігоддзе, якое ніколі не пражывала. Зараз многія рэчы могуць падавацца дзіўнымі, нязвыклымі, лухтовымі, але я пражыла гэтыя гады. Спадзяюся, вы пражывяце маё пражыванне.

## 1980

Давайце ўявім, што гэта наш першы год жыцця. Мы — дзеці, якім трэба даведацца, што стол — гэта стол, падлога — гэта падлога, шафа — гэта шафа і яе чапаць нельга.

Таму тлумачым сабе ўсё, як дзецям. Вам — таксама.

У той час часопіс дзяліўся на два вялікія блокі. Першы — «Проза–паэзія», у якім, адпаведна, проза і паэзія. Другі — «Публіцыстыка», туды ўваходзіла мноства разнастайных праектаў.

Першы часопіс я выпусціла з рук, і ён нахабна разгарнуўся на рубрыцы «З Леніным у сэрцы». Я магла ўразіцца чымсьці іншым, але мне наканавана было ўразіцца гэтым. З гэтага і пачнём.

Працы класіка беларускай фотажурналістыкі Валянціна Ждановіча, хутчэй за ўсё, ужо згадвалі тут, і не раз. Гэта дзеля іх ствараліся ў 1980–х каляровыя ўклейкі. Праз фотаздымкі заўсёды відаць, наколькі чалавек любіць тое, што робіць, наколькі ён любіць герояў сваіх фотаздымкаў. Ждановіч любіў. І таму мне цяпер хочацца чытаць і «З Леніным у сэрцы», і матэрыялы, у якіх, на першы погляд, няма нічога акрамя ідэалогіі. Валянцін Ждановіч зафіксаваў фотаздымкамі цэлы пласт нашай гісторыі: самых розных людзей — шырока вядомых, вузка вядомых і зусім невядомых; самыя розныя месцы — якія ёсць і цяпер і якіх няма; самую розную архітэктуру — якую сёння можна пабачыць і якую пабачыць ужо нельга.

Вельмі карыснымі для асэнсавання літаратурнага працэсу з'яўляюцца «Нататкі крытыка» пра маладую беларускую літаратуру: агляд маладой беларускай прозы і маладой беларускай паэзіі за папярэдні год.

Ярка гучыць тэма вайны: матэрыялы, прысвечаныя святкаванню 35–годдзя Перамогі, летапіс народнай славы Шумілінскага народа, проза, прысвечаная партызанскай хроніцы, паэзія, прысвечаная вайне. Твор, які выйграў у конкурсе «Дружба» — Вольгі Іпатавай — таксама прысвечаны вайне. У гэты год ваенная тэма лунае над часопісам, трымае і не адпускае.

Тут шмат прозы, напісанай ад першай асобы, шмат дзённікавых запісаў і дакументальных твораў. Ці ёсць жаданне асэнсаваць пражытае або пражыць яго яшчэ раз?

Не ўсе нумары часопіса, як бы нам таго ні хацелася, ёсць у рэдакцыі. Нешта даводзілася вышукваць у іншых месцах, аднаўляць творы, надрукаваныя ў асобніках, якіх не хапае.

*— Трымайце, Святлана, — галоўны рэдактар выдае мне на рукі часопісы з кабінетнай шафы. — Шкада, але нечага не далічыцеся. Прычым, я ўпэўненая, што самага выбітнага.*

У рэдакцыйным стосе 1980 года не хапае двух нумароў: першага і другога. У гэтых нумарах былі надрукаваны «Чорны замак Альшанскі» Уладзіміра Караткевіча і «Квантэмы» Алеся Разанава. Дадаваць штосьці залішне.

Раіса Баравікова, Ларыса Геніюш, Данута Бічэль–Загнетава. Паэтычныя (і месцамі празаічныя, як Баравікова) зорачкі года.

## 1981

Гэты год і праца па яго даследаванні далі мне ў поўнай меры ацаніць значэнне анкет у часопісах. Тыя, каго мы ведаем цяпер як класікаў і заслужаных, тады, яшчэ маладыя, адказвалі на пытанні, перадавалі сваё адчуванне сучаснага ім літпрацэсу. Гэта не літаратурная крытыка ў поўнай меры, нават блізка не яна, але ты глядзіш, якія імёны яны называюць, як ацэньваюць творчасць тых, з кім існуюць у адной прасторы, як адчуваюць гэтую прастору, — і можаш пасля чытаць часопіс ужо іх вачыма, назіраць, як зусім маладыя — ледзь–ледзь за дваццаць — і старэйшыя спрачаюцца адзін з адным у творах. Але пра ўсё па чарзе.

Пакуль яшчэ застой, які адчуваўся паўсюдна, у тым ліку і ў літаратуры. Ён адчуваўся і ў словах: «Мяне, прызнацца, не задавальняла ў свой час гэтая традыцыйная плынь маладой нашай паэзіі: здавалася, што ў ёй зачаста адсутнічае пошук новых форм і свежых, некранутых тэм. Але сёння, павандраваўшы па многіх нарадах

і фестывалях, гэтае, традыцыйнае якраз і бачу галоўнай заваёвай нашай маладой паэзіі» (Мікола Мятліцкі). Гэта пра паэзію, але ўсе прыведзеныя мной у двухкоссях словы, здаецца, можна цалкам пераносіць на прозу. І гэта адно меркаванне, але было іншае: «Маладых паэтаў можна папракнуць у запаволенасці, у таптанні на адным месцы, у нейкай прыцішанасці іх голасу, але гэта на першы погляд. Я думаю, што крытыка, ды і не толькі яна, магла заўважыць, што гэты «наступны вал» ужо выспявае, не сёння, дык заўтра ён гатовы выбухнуць» (Раіса Баравікова). Так, і я адчуваю. Адчуваю, пра што вы.

Яшчэ застой, але ўжо ёсць прадчуванне чагосьці новага. Яно ёсць у тэкстах: іх аўтары чакаюць, яны адчуваюць, што нешта змяняецца, дзесьці нават улоўліваецца гэта паветра, якім будуць дыхаць у перабудову.

Ярка гучаць ваенныя тэмы. Але яны выглядаюць ужо інакш. Узнікае пытанне: хто можа пісаць пра вайну? Мы не бачылі вайны. Мы можам пра яе пісаць? Так ці не? А калі ты заспеў наступствы вайны? А калі памяць блізкіх адклікаецца так моцна і балюча, што ты не можаш не пісаць пра вайну? Водгукі гэтай палемікі гучаць на старонках года.

*Аляксей Дудараў: «Аднак гучыць гэтая тэма водгласам, які праходзіць праз сэрца і думкі сучасніка. Вельмі ўжо страшны след пакінула вайна на зямлі нашай. Гэты водглас гучыць у творах А. Жука, В. Гігевіча, В. Іпатавай (хаця гэтых пісьменнікаў маладымі назваць можна толькі ўмоўна, хіба толькі па ўзросце, а па глыбіні пранікнення ва ўнутраны свет нашага сучасніка гэта творча сталыя літаратары, у якіх мы, маладзейшыя, шмат чаму вучымся)».*

Моцна прагучалі тэмы сям'і, шлюбу, выхавання, разводу, узаемапаразуменняў — майго/нашага, узаемадапамогі і самастойнасці. І, як адказ, гучыць у прозе тая ж тэма: і пра каханне, і пра шлюб, і пра жаноча–мужчынскія стасункі. Можа, гэта толькі маё ўяўленне, сапсаванае сучаснай ironіяй ды пост–іроніяй, бачыць тут цікавостку, але я не магу на гэты конт прамаўчаць: неяк іранічна гучыць у плыні сямейнай тэмы аповесць пра вандроўныя прыгоды халасцяка Анцюхі ад Вячаслава Дубінкі «Не плач, душа мая», якую рэдакцыя ў 1982–м прызнала лепшай празаічнай публікацыяй.

У нумары шмат дасведчаных аўтараў, якія выглядаюць тытанамі побач з такімі літаратарамі, як, напрыклад, 23–гадовы Адам Глобус. Але менавіта маладыя аўтары прыўносяць прадчуванне перамен. Я не магу не сказаць пра Уладзіміра Арлова, які знаходзіцца ў пошуку сваіх пачуццяў, не магу не сказаць пра Галіну Каржанеўскую і Таісу Бондар. Я гатовая згадваць пра Яўгенію Янішчыц, пакуль яна друкуецца ў «Маладосці», бо яна ў маім сэрцы заўсёды.

## 1982

Што нельга прапусціць, дык гэта вокладкі. Візуальны складнік «Маладосці» увогуле не мог быць кепскім — хаця б таму, што ў рэдакцыі працаваў Валянцін Ждановіч — чалавек з выдатным густам, пачуццём кампазіцыі і ўсімі іншымі пачуццямі, неабходнымі фатографу. Што датычыцца вокладак, то ў гэты год рэалізоўваўся праект Валянціна Ждановіча і Уладзіміра Крукоўскага. Праца мастака заснавана на фатаграфіі, што і цяпер, праз амаль 40 гадоў, выглядае цікава, стылёва.

М. Захаркевіч. Адплата кахання (лінарыт, 1972 г.), ілюстрацыя з №6 за 1982 г.



У 1982–м — стогадовыя юбілеі Янкі Купалы і Якуба Коласа. «Маладосць» не магла гэта праігнараваць: на працягу ўсяго года публікаваліся разнастайныя матэрыялы, прысвечаныя абодвум пісьменнікам. У празаічным блоку надрукавана кніга Алега Лойкі пра Янку Купалу «Як агонь, як вада ...» Спрэчная, вельмі спрэчная рэч. Але гэта менавіта тое, што трэба, каб зацікавіцца, для тых, хто нічога пра Янку Купалу не ведае, бо ў школе ў адно вуха ўлятала, праз другое вылятала. На кнігу цяпер ставяць маркіроўку «для старэйшага школьнага ўзросту», накручваюць віткі пафасных рэцэнзій ды анатацый. А на самой справе тое, што было апублікавана ў «Маладосці» ў 1982–м, — цікавостка на мяжы скандальнасці ў прафесійных колах з–за вольнасці ў абыходжанні з гістарычнымі асобамі.

Хапае тэкстаў, прысвечаных сучаснасці. Ужо больш людзей цікавіцца жыццём, якое навокал, а не тым, што засталося ў мінулым. Вельмі добра адчуваецца сацыяльны кантэкст.

Даследаванне поўначы, пошук карысных рэсурсаў, будоўля. У часопісе друкуецца шмат аўтараў, у чыіх біяграфіях пазначана «працаваў (або працуе) на будоўлі». Вось Алесь Масарэнка піша пра Сібір, вось «Камчацкія эцюды» Вячаслава Дубінкі. Тэма года. Мой бацька паехаў працаваць у Сібір на два гады пазней, але таксама паехаў.

Дзеці бягуць з вёскі, з'язджаюць у горад — не толькі ў гарады БССР, але рассыпаюцца па ўсім СССР. Адсюль вельмі балюча гучыць тэма вёскі. Бо ў вёсцы засталіся бацькі. Пажылыя адзінокія бацькі. Пажылыя адзінокія бацькі, у якіх часу не так шмат, а сын іх сёлета не прыедзе. Драматычна, ці не так? Мая маці ў 1982–м годзе скончыла ўніверсітэт і паехала працаваць у Гомель.

Тэма стасункаў з бацькамі рэалізоўваецца тонка і прыгожа, груба і амаль нечытэльна, але яна гучыць і адгукаецца вельмі востра. Не дзіўна, што ў рэдакцыйным стосе часопісаў за 1982–і не знайшлося № 9, у якім друкаваліся вершы Яўгеніі Янішчыц. Там жа былі змешчаныя творы Ірыны Жарнасек (апавяданні «Споведзь» і «Матчыны пасцілкі»), якія рэдакцыйная калегія адзначыла як лепшае за той год. У якасці найлепшага паэтычнага выступлення адзначылі вянок санетаў Уладзіміра Дзюбы.

Выдатна і выбітна, ярка сярод астатніх: Раіса Баравікова, Данута Бічэль–Загнетава, Уладзімір Някляеў (яго «Размова з аўтаінспектарам не пра паэзію» прыносіць дух сучаснасці ў паэзію), Уладзімір Арлоў (піша ярка і не замаруджана), Змітрок Падбярэзскі (у 2016–м будзе наміневаны на прэмію Ежы Гедройца), Віктар Шніп (22–гадовы хлопец з сапраўды выбітнымі вершамі).

## 1983

Тут я адчула, што проза пачала больш выразна дзяліцца на вясковую і гарадскую. Яны практычна зраўняліся ў колькасці. І гэта дало магчымасць ацаніць адрозна гучання ў тэмах кахання, сямейных стасункаў і працы. У вясковай і гарадской прозе па–рознаму раскрываюцца аднолькавыя матывы, зацінаюць адны і набіраюць сілу іншыя, у залежнасці ад месца з'яўляюцца новыя падтэмы і новыя шляхі іх раскрыцця. «Вясковыя» адценні цікавым чынам разгортваюцца ў гарадскім антуражы.

Аўтараў цікавяць стасункі ў маладой сям'і: чаму такі вялікі працэнт разводаў і чаму развод — гэта кепска? А хіба можна жыць у сям'і, калі ты не любіш, калі не любяць цябе, калі паміж вамі адлегласць і ўмешваецца рознасць вясковай і гарадской прастор, калі твой каханы не ўпэўнены: у табе, у сабе, ва ўсім, — калі цябе прыніжае?

Псіхалагічны гвалт у сям'і вельмі яскрава пададзены ў апавяданні Іны Казловай «Будні і свята». Гвалт можа здзяйсняцца не толькі над жанчынай, але і над мужчынам, з жаночага боку.

У гэтым годзе дэбютуе Алесь Наварыч з творамі «Сутыкненне з вечнасцю», «Месячнай ночу», «Смак святаянніку». Друкуюцца «Думкі ўроссып» Барыса Сачанкі. У «Нататках крытыка» — тэкст Яўгена Гарадніцкага «Маладосць — хуткакрылая птушка». Шмат цяпер гаворыцца пра кліпавае мысленне нулявых, але тут, у 1980–х, ёсць яго аналаг, прататып. Па часопісных публікацыях можна прасачыць, наколькі папулярным было імітаваць дзённікавыя нататкі, спалучаючы розным чынам рознажанравыя кавалачкі тэкстаў.

Першы раз друкуецца Анатоль Сыс. Пакуль ва «Усмешках маладосці», на перадапошніх старонках. На самай апошняй — з біяграфіямі — ён яшчэ не пазначаны, але ўжо амаль у літаратуры. Сыс — як подых перабудовы!

## 1984

Я хацела б напісаць «вайна» і перакрэсліць.

Бо людзі, якія пісалі пра вайну ў той час (ды і не

толькі ў той), пісалі таму, што не хацелі, каб вайна была. Пра вайну пісалі, каб яе не было. Дзіўна, так?

Менавіта вайне прысвечаны гэты год. Не дзіўна, насамрэч, бо адзначаецца чарговы юбілей вызвалення Беларусі. У кожным нумары з'яўляецца публіцыстыка, прысвечаная заканчэнню Вялікай Айчыннай вайны. Гэтая тэма гучыць паўсюль: у прозе, паэзіі, крытыцы. З'яўляюцца старонкі «паэзіі перамогі», дзе выказваюцца пра вайну тыя, хто яе перажыў, тыя, хто заспеў пасляваенны час, тыя, хто ведае пра яе па ўспамінах блізкіх. Але была не толькі гэтая вайна. Раман «Гаспадар–камень» Генрыха Далідовіча прысвечаны пярэдадню Першай Сусветнай.

Каб не было вайны, трэба пісаць пра вайну. Дзіўная рэч. І ў першым нумары з'яўляецца верш Ірыны Багдановіч, якая друкуецца ў «Маладосці» ўпершыню. Яна, можа не вельмі дасканала, але гаворыць пра тое, што яе хвалюе ў вайне. І мяне хвалюе таксама.

Чытаю я часопісы, газеты —
Што мой сучаснік скажа пра мяне?
Паэт–равеснік, неспакойны, дзе ты? —
Мо на старых куплетах збалбатнеў?

Усё апяваеш росныя сцяжыны
І зорку ў жыцце — родны васілёк?
Яно някепска ўвогуле, магчыма,
Ды ўсё–ткі ад галоўнага здалёк.

Дарэчы, да тэмы вайны. Гэта можа быць не пра зброю і смерць, а пра тую вайну, якая адбываецца ўнутры асобы. Такія творы ёсць — гэта адначасова эмацыянальная і стрыманая паэзія Валянціны Коўтун і напружаная, быццам палымяная паэзія Валянціны Хамчук. Адзначаю заўважаны спачатку рэдакцыяй, а потым — праз гады — мной твор Івана Клімянкова «Сеанс гіпнозу». Чалавек перажыў за колькі хвілін дваццаць гадоў і вярнуўся амаль у тую ж кропку. Нечакана, свежа, смела. Амаль бунт асобы і бунт унутры асобы — вайна з сабой.

Мо і зараз пра тую, якая «вайна…», трэба пісаць не як пра ўзбраенне, дрыгву і партызан, а як пра вайну рэчаіснасці, якая вядзецца ў дробязях?

## 1985

Сучаснасць выпала са старонак і, здаецца, разбілася пры палёце з 1984–ага паверха–года. Да актуальнага вяртаецца не сам часопіс, а толькі асобныя аўтары.

Адчуваецца страх тагачаснага, страх азірнуцца вакол. Больш хочацца глядзець на перажытае. Ёсць светлае пачуццё настальгіі, праслізгваюць адценні тугі па нечым такім, што сышло, — па любові і людзям. Свет змяняецца, рухаецца, але выдатна заўважаецца, што рухаецца ён па спіралі.

*— У мяне зараз, у 1980–х, вёска так востра, балюча загучала.*

*— Яна ж балюча загучала у 1970–х, не?*

*— Яна ўжо востра гучала ў мяне ў 1960–х, пра што вы?*

Кожнае пакаленне праходзіць праз адны і тыя ж тэмы, якія набываюць моц у кожным дзесяцігоддзі: штосьці здараецца і зноўку б'е па тэме вёскі, сям'і, вайны і гэтак далей.

*«Дык ці правамерны зноў гэтыя настальгічныя матывы? Добра, калі вядомыя сітуацыі, ад якіх ствараецца адчуванне паўторнасці, аднастайнасці, вар'іруюцца маладымі аўтарамі ў якасці часовай майстэрні, адкуль пачынаецца празаік, дзе ён лепіць першыя вобразы, падступаецца да характараў, імкнецца разабрацца ў самім сабе, сваіх пачатках». (Людзія Савік)*

Ілюстрацыя да рамана «Меч князя Вячкі».



Але, у той жа час, адчуваецца жаданне жыць. І потым — немагчымасць здзейсніць гэтае «жыць» праз штосьці. Жаданне жыць досыць моцнае ў паэзіі другога нумара. А потым — да канца года — прасочваецца пытанне: як рэалізаваць гэта «жыць»? Праз ваенную тэму ці праз штодзённасць?

Пачынае гучаць гістарычная тэма: не гісторыя болю, не гісторыя траўмы XX стагоддзя, а чагосьці больш глыбокага. З'яўляецца верш Міколы Арочкі, прысвечаны старажытнай архітэктуры. І выбухае «Меч князя Вячкі» Леаніда Дайнекі.

## З кнігі «Скрозь «Маладосць»...»

Добра ведаючы, што ў той час найперш у «Маладосці» можна надрукаваць гістарычны твор, да мяне звярнуўся вядомы паэт і ўжо заяўлены празаік Леанід Дайнека: прачытай мой раман і спачатку толькі мне выкажы сваю думку. Прачытаў. У гаворцы сам–насам зазначыў яму: ты абраў для расповеду вельмі цікавыя, але малавядомыя эпізоды з нашай гісторыі (я ўведаў пра іх ад М. Ермаловіча) — барацьбу Полацка і полацкага васала з Кукейноса князя Вячкі на пачатку XIII стагоддзя супраць крыжакоў. Але чаму табе найперш спасылацца на «Хроніку» Генрыха Латвійскага? Паслухай і іншага Генрыха: узбуйні паказ таго, што Полацкая зямля была не часткай Кіеўскай Русі, а многія стагоддзі самастойнай дзяржавай. «Дык ты гэта падтрымаеш?» — «Падтрымаю. Будзем націскаць на тое, што палачане і кукейносцы змагаліся супраць навалы з Захаду. Тым больш, што Вячка дзейнічаў у саюзе з Ноўгарадам». — «А ў выдавецтве? У Маскве?» — «Давай спачатку падумаем пра "Маладосць". Як казалі бальшавікі, спачатку ўвяжамся ў бой, а пасля будзем вырашаць астатняе». Леанід узяўся пераглядаць канцэпцыю твора, і трэба сказаць, што ён умее працаваць напружана. Праз некалькі месяцаў быў ужо ў многім новы раман «Меч князя Вячкі». Аўтар, як і Караткевіч, не пазбягаў паэтычнай рамантызацыі, але яна была на моцнай дакументальнай аснове. Разам з пазнейшым раманам «След ваўкалака» гэты твор заняў пачэснае месца ў нашай літаратуры.

*Генрых Далідовіч*

Подых новага адчуваецца — уздымаецца тэма вайны з ментальнага боку: а ці патрэбна ўвогуле вайна, што разгараецца ўнутры асобы?

Маладыя аўтары спрабуюць адысці ад статыкі, ад запаволеных апісанняў. З'яўляецца рух — жаданне бегчы (ці збегчы?). Дык, можа, ім, маладым, усё ж патрэбны «усе прэтэнзіі, усе хістанні, якія нас агортваюць штодзённа»? Бо гэта не «псеўдазмаганне», гэта штосьці больш значнае, пра што трэба казаць.

## 1986

Пачатак «перабудовы» ў нашым часопісе — гэта пачатак часу без Уладзіміра Караткевіча і з Анатолем Сысам. Калі не пераносіць з'явы на людзей, то можна сказаць так: сыходзіць рамантызм і прыходзіць «нешта яшчэ».

У 1984 годзе ўжо дэбютаваў *Сяргей Кавалёў*, піша *Адам Глобус*, «упершыню» ў «Маладосці» надрукаваўся і сам *Анатоль Сыс*, імя якога з'явілася на апошняй старонцы ў раздзеле «Нашы аўтары». І мы ведаем год стварэння суполкі «Тутэйшыя».

У 1984 годзе памёр Уладзімір Караткевіч. І літаратурнае спадарства «накрыла», здаецца, праз год. З'яўляецца шмат прысвечаных яму вершаў. У тым жа 1984 годзе ён з сябрамі адправіўся ў паход па Прыпяці. Адным з гэтых сяброў быў Валянцін Ждановіч. Яго прац стала менш яшчэ ў папярэднім годзе. У гэтым годзе ад яго работ вее смуткам.

У часопісе часцей з'яўляюцца працы іншых фатографаў. Валянцін Ждановіч вельмі цяжка ўспрымаў падзенне накладу. І мне сумна глядзець, як гэты чалавек, які стаў амаль блізкім праз успаміны аб ім, сыходзіць у дэпрэсію.

Можна выразна ўбачыць кантраст, які вырастае паміж прозай і публіцыстыкай. У публіцыстыцы ідзе ўсхваленне чалавека, працоўных.

Друкуецца падборка вершаў «...Міру галінка ў добрай руцэ», ганарар за якую пералічаны ў фонд міру па згодзе аўтараў. Ваенная тэма ўсё яшчэ гучыць, але цяпер гэта не боль вайны, а шчасце ад яе заканчэння.

Што адбываецца ў прозе? Яна становіцца больш эмацыйнай, больш пачуццёвай, што было ў ёй і раней, але некуды было знікла. Эмоцыі транслююць «Дзённік Жанчыны» Таісы Бондар, «Камандзіроўка за мяжу» Лідзіі Арабей, «Тэлеграма» і «Неадпраўленыя лісты» Паўла Савоські. Я засталася пад вялікім уражаннем ад таго, як апошні апісвае свае пачуцці, калі да яго дакранаецца жанчына — вось тая пачуццёвасць на мяжы з эратызмам, якая была ў Міхася Зарэцкага на пачатку стагоддзя.

Многія маладыя аўтары грашаць тым, што называюць эмоцыю і не даюць чытачу яе адчуць, пражыць. Але тут я сама пачала часцей пражываць. Такое адчуванне, што ў гэтым ёсць нейкая заканамернасць: ці самі аўтары пасталелі (але калі гэта былі ўжо сталыя аўтары, ці можна казаць пра іх «пасталелі»?), ці ім дазволілі адчуваць (але хто дагэтуль адчуваць забараняў)?

Я не жыла тады, але, можа, з перабудовай з'явілася права на пачуццёвасць?

## З кнігі «Скрозь "Маладосць"...»

Што ж сабою ўяўляла тая атмасфера?

Быў Галоўліт — міфічная арганізацыя, якая мела неабмежаваную ўладу над друкаванымі выданнямі, бо толькі яна давала «дабро» на выхад твора ў свет. Часцей за ўсё з гэтай арганізацыяй сутыкаліся супрацоўнікі рэдакцый, і гнеў аўтараў, якіх «зарэзалі», часта выліваўся менавіта на тых, хто быў змушаны круціцца паміж патрабаваннямі Галоўліта, — хоць і няпісанымі, але ўсім вядомымі, — і творчымі памкненнямі творцаў, якія, канечне ж, лічылі свае працы геніяльнымі.

Пра што нельга было пісаць?

Што міліцыянеры могуць быць кепскімі. Тое, што міліцыя кепская — пра гэта і заікацца нельга было.

Што партыйныя дзеячы ганьбяць славу КПСС.

Што ёсць таямнічая арганізацыя, якая называецца КДБ і ў ёй ёсць такія супрацоўнікі, якіх ніхто не ведае — кадэбісты называюцца…

Што ў арміі ёсць «дзедаўшчына», — лыжкамі прысягу прымаюць…

Калі б ведалі вы, колькі было тэм забароненых…

Нават пра ўсім цяпер вядомы секс пісаць залішне было нельга. Кажуць, адзін аўтар у тыя часы выдаў кніжыцу пад назваю «Пакінутая на досвітку». Кніжыцу, кажуць, «размялі» за тыдзень. Думалі, што пакінутай на досвітку была каханая. Аказалася, гэта вёска…

*Васіль Гігевіч*

Пра класічную тэму вайны я ўжо сказала. Ёсць не менш класічная і не менш вечная для беларус-кай літаратуры тэма зямлі. Што ёсць зямля? Месца, дзе ты жывеш. І маецца на ўвазе ўсвядомленае стаўленне да сваёй зямлі: гэта не абстрактная глеба, а твой горад, мікраараён, твая вуліца. Тэма, якая была звыкла вясковай, перайшла на гарадскую прастору.



Малюнак Юрыя Калядэнкі, № 3 за 1986 г.

## 1987

Здаецца, што перабудова калі не задыхала на поўныя грудзі, то хаця б пачала рабіць паўнавартасныя ўдыхі і выдыхі. У 1986–м была створана літаратурная суполка «Тутэйшыя», якая і гучыць у 1987–м на старонках часопіса. Гэтыя нумары набраліся бунтарскім духам, прагай перамен. І «Маладосць» гэты год сапраўды маладая: дынамічная, рэзкая, жывая, наватарская і смелая.

Сацрэалізм «патрабуе ад мастака праўдзівага, гістарычна–канкрэтнага малюнка рэчаіснасці ў яе рэвалюцыйным развіцці». «Гістарычна–канкрэтнае» — гэта не вобразнае, не метафарычнае, не у форме прыпавесці і г.д. З'яўляюцца казкі двух аўтараў

(Пятро Сіняўскі, Васіль Якавенка). І ўсё ж мае значэнне, каго рэдакцыя ўзнагароджвае за лепшы твор года. У прозе лаўрэатам года становіцца Віктар Шалкевіч. Яго творы — «У мястэчку», «24 гадзіны з жыцця майстра», «Падзенне» — коратка характарызуюць год: трохі містыкі, трохі гісторыі, балансаванне на мяжы рэальнасці і мроі.

Чым яшчэ адрозніваюцца мастацкія творы гэтага года? У іх яшчэ менш статыкі. Як у прозе, так і ў паэзіі. Адам Глобус пачынае прозу з дыялога. Сечаныя, дынамічныя, твораўтваральныя дыялогі ў Андрэя Федарэнкі. Жыва піша Сяргей Кавалёў: як прозу, так і крытыку.

## Сяргей Кавалёў

## Метро ля замчышча, альбо Талент на раздарожжы

(скарочана)

Што ж новага з'явілася ў маладой паэзіі ў мінулым годзе і што перайшло ад ранейшых часоў, склалася ва ўстойлівую з'яву?

Як частка агульнай тэндэнцыі паглыблення прынцыпу гістарызму не толькі ў літаратуры, мастацтве, культуры, але і ў грамадска–палітычным жыцці відавочна павялічылася ўвага да нацыянальнай гісторыі, паглыбілася і патрыятычна ўзвысілася разуменне яе. Калі раней вершы на гістарычную тэматыку пісаліся толькі некалькімі паэтамі (А. Мінкіным, С. Сокалавым), то зараз цяжка знайсці хоць некалькі паэтаў, якія б такіх вершаў зусім не пісалі. З'ява такая шчыра радуе і, як адлюстраванне змен і працэсаў у жыцці грамадства, — абнадзейвае, дае падставы меркаваць пра далейшыя якасныя змены ў культурным жыцці, у адносінах не толькі да сваёй нацыянальнай спадчыны, але і да нацыянальнай будучыні.

Аднак, калі сам зварот маладых паэтаў да гісторыі радуе і прыцягвае ўвагу чытача, то пра высокі мастацкі ўзровень гістарычных твораў як твораў паэзіі казаць пакуль не даводзіцца, акрамя, бадай што, асобных вершаў тых жа А. Мінкіна і С. Сокалава. Не даводзіцца па прычынах як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару. Вершы на гістарычную тэму пры ўсёй іх карыснасці і патрэбнасці часам завельмі дыдактычна–рытарычныя, праз патрыятычныя эмоцыі і заклікі не бачна ні гісторыі, ні мастацкасці; увагу паэтаў прыцягваюць усяго некалькі падзей і постацей: Грунвальд, паўстанне 1863 года, Рагнеда, Вітаўт, Скарына, Каліноўскі; гэта сведчыць пра вузкія веды аўтараў і ранейшую мастацкую неабжытасць нашага шматвекавога мінулага, пра схільнасць да сімвалізацыі і эмблемаізацыі гістарычных асоб. Няўжо Грунвальд і Крутагор'е маюць адносіны да фарміравання духу нацыі, а Ворскла, напрыклад, — не мае і паражэнні ніяк не адлюстроўваюцца ў народнай свядомасці? Маладыя аўтары, не маючы ўласнай мастацкай канцэпцыі гісторыі, у лепшым выпадку запазычваюць яе ў творах Уладзіміра Караткевіча, у горшым — абыходзяцца ўвогуле без яе, прычым не надта задумваючыся пра фармальную спецыфіку гістарычнай паэзіі.

Значна менш, чым калісьці, з'яўляецца зараз у маладых паэтаў вершаў пра Вялікую Айчынную вайну і, адпаведна, — менш эксплуатацыі гэтай тэмы, паэтычных падробак. Хаця слова «менш» — не азначае таго, што такія павярхоўна–гераічныя творы не з'яўляюцца зусім (верш З. Мінчанка «Урок мужнасці», напрыклад). Усё ж такі пасля Куляшова, Панчанкі маладому чалавеку 20–25 гадоў напісаць добры твор пра вайну цяжка, а благі — пісаць не варта. З усёй мінулагодняй паэтычнай прадукцыі на ваенную тэму можна вылучыць хіба што верш Валянціны Аколавай «У музеі Вялікай Айчыннай вайны»:

Сярод музейных экспанатаў
Ляжыць прастрэленая гільза.
Мікрон вайны. Жыццё салдата,
Які
У 20 год загінуў.
За 10 дзён да Перамогі,
За 40 год да смерці мамы.
— Яшчэ, вайна, цябе так многа.
А тых, хто выжыў, гэтак мала.

Строгая, канстатацыйна–матэматычная форма выяўлення дазволіла аўтарцы сказаць мала, але істотна, стварыць верш сцісла–змястоўны, шкада толькі бачыць у гэтай форме выпадковы прыём, а не свядомую манеру выяўлення. Пасля цудоўнага верша Валянціна Жданко «Кожны першы», калісьці надрукаванага «Полымем» і адзначанага Піменам Панчанкам, верш «У музеі Вялікай Айчыннай вайны» — ці не лепшы твор са змешчаных маладымі паэтамі ў газетах і часопісах вершаў пра вайну.

Ваенная тэма для творчасці маладых паэтаў мае асаблівае значэнне, але наколькі важнае, настолькі і небяспечнае: яна добра распрацавана папярэднікамі, а зварот да яе скарачае шлях да публікацыі. Разам з тэмай любові да Радзімы і тэмай кахання яна ўтварае той магічны трохкутнік, у які перш за ўсё заганяе сябе нявопытны пачатковец і ў якім цудоўна адчувае сябе прафесійны графаман. І першы, і другі дыскрэдытуюць свядома ці падсвядома і гэтыя вялікія

тэмы, і паэзію ўвогуле. Але зараз болей пішуць не пра вайну, а пра памяць аб ёй, напрыклад, — пра маці, якая чакае сваіх загінуўшых сыноў.

Вочы выцвілі, як валошкі...
Паўстагоддзя амаль мінула...
Ды чакае б а б у л я моўчкі.
Трох сыноў — в а й н а не вярнула.

З а г а м о н і ц ь в е ц е р на вуліцы —
Зварухнуцца ў хаце шторы,
І... да шыбіны тварам туліцца:
«Мо вярнуўся ўсё ж каторы?!»
(Віктар Трусевіч. *«Чаканне»*)

Сівенькая б а б к а сядзіць на падворку,
Здаецца, вядзе з некім блізкім г а в о р к у.
Адна, як былінка, свой век звекавала —
В а й н а ўсю сямейку з сабою забрала...
Адно, што в я т р ы с к а насвіствае
з клеці,
А ёй раптам здасца, што там — яе дзеці...
(Алесь Пісарык. *«Сівенькая бабка...»*)

Наўмысна падаём гэтыя два вершы побач не толькі для таго, каб была заўважана іх тэматычная еднасць. Не, з прадукцыі аднаго года пры жаданні можна было б выбраць і значна больш прыкладаў тэматычнай еднасці. У дадзеным выпадку — відавочнае падабенства прынцыпаў пабудовы верша, стэрэатыпнае выяўленне тэмы; абавязкова; бабулька, вайна, напаўрэальная гаворка, вецер; і, па выбару: хата альбо падворак, вецер на вуліцы альбо ў клеці, дзеці альбо сыны. Розніца толькі ў тым, што ў першым выпадку пачатковец выкарыстаў стэрэатып падсвядома (хочацца верыць), а ў другім, больш ужо вопытны паэт, — свядома (хацелася б памыліцца) паклаў яго ў аснову твора. Стэрэатып надзвычай распаўсюджаны, хоць ты складай анталогію вершаў–чаканняў, і што самае жахлівае — непарушны і дзейсны. Нас кранае сам жыццёвы тып, факт, але зусім не вершы А. Пісарыка і В. Трусевіча, якія эксплуатуюць гэты факт разам з нашымі пачуццямі.

…

Заўважна, што ўсё больш маладых паэтаў пачынаюць шукаць для сябе мову прадметна–канкрэтную, пашыраючы лексічнае кола паэзіі, зксперыментуюць менавіта з моўным матэрыялам, імкнуцца не шукаць асобныя разовадзейсныя паэтычныя прыёмы, а ўпарта, па драбку канструююць сваю ўласную апазнавальна–азначальную манеру выяўлення, спецыфічна індывідуальную і мастацкую ў кожным першаэлеменце, моўным адрэзку, нават незалежна ад агульнай кампазіцыі і рацыянальна–пачуццёвай задумы цэлага твора. Мінаюць часы, калі ролю першаснай адзнакі паэзіі адыгрываў рытм, і ў першую чаргу — рытм моўны; усё большую ролю ў паэзіі адыгрывае зараз спецыфіка паэтычнага мыслення, моваскладання, рытм змены асацыяцый і вобразных значэнняў. Думка, выкладзеная ў адным з вершаваных памераў і аквечаная рыфмай, не робіцца ад таго паэтычным творам і, нават калі яна сама па сабе паэтычная, усё роўна патрабуе спецыфічнага выяўлення ў спецыфічнай мове.

Прыкладам гэткай двайной спецыфікі з'яўляюцца творы Леаніда Дранько–Майсюка. Не так ужо і мала пісалася (і будзе пісацца) пра адметнасць яго паэзіі; пра міфалагічнасць яе і кінематаграфічнасць, пра канкрэтнасць дэталяў і ўмоўнасць агульнай фабулы, пра местачковыя вытокі паэтычнага побыту і вялікае значэнне для верша элементаў гульні, казкаскладання. Але найбольш плённае і лаканічнае азначэнне паэзіі Л. Дранько–Майсюка даў калісьці Варлен Бечык: «нязвыклая». І думаючы пра яе нязвыкласць, разумееш такім чынам, што ёсць у нас паэзія і «звыклая», якая дамінуе і надзейна трымае свае пазіцыі ў літаратуры ўвогуле і ў выдавецкіх планах у прыватнасці.

…
Богам створаная проза,
Д'яблам высненыя вершы —
Я стаміўся. Над парогам
Пчолы кружацца і шэршні, —

пачынае адзін са сваіх вершаў Л. Дранько–Майсюк; але, калі адарвацца ад індывідуальнага міфапаэтычнага канструявання паэта і задумацца над пытаннем, кім жа ў першую чаргу створаны яго вершы, адказ, канечне, будзе просты: самім паэтам. Самім паэтам пабудаваны (лепш сказаць — будуецца) і дзіўны паэтычны сусвет: на аснове рэальнага сусвету і адэкватны яму ў дэталях, але не адэкватны па сэнсе, па функцыянальным прызначэнні. Матыў будаўніцтва настойліва праводзіцца з першай кнігі паэта ў другую, вандраванне акрэсліваецца ў месцазнаходжанне, давыд–гарадоцкі каларыт яшчэ больш узмацняецца, набывае сімвалічныя праявы і кладзецца на сусветную карту. Гэта, так сказаць, — будаўніцтва знешняе, зафіксаванае ў тэксце, канчатковы абагульнены вынік мастацкай працы ў канкрэтных вершах. Унутранае будаўніцтва — на ўзроўні псіхалогіі і тэхналогіі творчасці: праца над далейшай крышталізацыяй творчай манеры, пошук новай традыцыі, удасканаленне

мовы ў лексічным і сінтаксічным плане, шлях да ўспрымання паэзіяй іншага віду мастацтва (жывапісу, напрыклад), імкненне судакрануцца там з найбольш суадчувальна блізкім уласнай манеры, з найбольш прыдатным і плённым для творчасці.

Вершы Леаніда Галубовіча — падкрэслена традыцыйныя і падкрэслена таленавітыя. Падкрэсленыя і вылучаныя крытыкай, старэйшымі паэтамі; таленавітыя — самі па сабе, сваёй дзіўнай паэтычнай энергіяй, арганічным адчуваннем жыцця аўтарам, непадзельнасцю яго паэтычнага сусвету з сусветам рэальным, іх узаемапранікненнем і ўзаемаўплывам. Не кранаючы, па сутнасці, паэтычную форму, Л. Галубовіч значна ўзмацніў змест; узмацніў за кошт павышэння ціску паэтычнай атмасферы і павелічэння тэмпературы думкі, за кошт узмацнення пульсацыі пачуццяў у радках.

«Бурная» станоўчая рэакцыя крытыкі і чытацкай аўдыторы на першы зборнік Л. Галубовіча спачатку толькі радавала. Сапраўды, зборнік вылучаўся (і не губляўся) індывідуальна на фоне беларускай паэзіі, а патэнцыяльныя магчымасці аўтара давалі падставы спадзявацца і на далейшы плён.

Але нечакана бурнае ўспрыманне творчасці паэта ўвогуле пачало замінаць нармальным ацэнкам яго канкрэтных твораў, і той жа зборнік «Таемнасць агню» пад гул авацый так і не быў, па сутнасці, прафесійна, усебакова разгледжаны. У выніку, замест таго, каб спакойна, без перашкод працаваць у паэзіі, гарманічна развіваць свае бясспрэчныя здольнасці, малады паэт вымушаны быў альбо змагацца са славай, альбо кінуцца да яе ў абдымкі, бо не заўважаць яе ён не мог ні па ўласцівасцях чыста ўнутраных, ні па прычынах знешніх. Пасля аднаго паэтычнага вечара, дзе нават самому Леаніду Галубовічу было, відаць, ніякавата ад незлічоных усхваляваных слоў, кампліментаў і публічна прадэкламаваных маладымі паэтэсамі вершаў–прысвячэнняў, — увогуле здзіўляешся, як мог ён потым пісаць добрыя творы і захаваць хоць крыху самакрытычнасці і дастатковай незадаволенасці зробленым.

У Адама Глобуса выпрацавалася свая, апазнавальна–выразная манера выяўлення, але з шырокім дыяпазонам варыянтаў, што ратуе ад павярхоўнай зададзенасці і аднастайнасці. Як пластычна і выразна, напрыклад, малюецца вецер у аднайменным вершы, сціслым і інфарматыўна–кампактным:

Ён брахаў скалазубым сабакам,
І на коміне чортам выў,
І завязваў вузламі дым,
За фіранкамі ціха плакаў...

Праўда, у падборцы прысутнічаюць і вершы відавочна недаробленыя, сырыя: «Парасоны», «Займеннікі», і калі першы з іх увогуле не выклікае ніякай цікавасці, то ідэя другога твора (небяспека пратэзацыі і штучнасці чалавечага жыцця, чалавечых пачуццяў) — цікавая і паэтычна–дзейсная, вось толькі цяжка дабрацца да яе і да трох наступных строф праз першую, «калекапратэзную» страфу, кангламерат верша і лекцыйнага паведамлення:

На мяжы навукі і прыроды
Здольны перспектыўны чалавек
Збудаваў пратэзныя заводы,
Каб загрыміраваць калек.

Але прываблівае ў гэтым паэце яго прага да самаўдасканалення і самаасэнсавання, заўсёдныя пошукі і эксперымент, і ці не таму так шпарка развіваецца яго талент?

Вось і ў традыцыйна–пачуццёвага паэта Алеся Пісьмянкова заўважаецца той самы няспынны пошук, хаця і зусім у іншым кірунку. Не ўсе яго вершы пазбаўлены ўласных шаблонаў і агульных недахопаў, але такія, як «Ён жыў, любіў і верыў», «Прасіць мне рана пакаяння...», «Дупло», прыадчынілі нам новыя ўласцівасці яго таленту, ды і напісаны ў традыцыйнай манеры верш «Мой сад у снезе па калена» заслугоўвае права быць прызнаным за лепшы песенны тэкст года, калі ім зацікавіцца кампазітар з добрым густам.

Верш А. Пісьмянкова «Дума Вітаўта» — адзін з цікавейшых гістарычных вершаў гэтага года, хаця ў творчым падыходзе да мінулага, у канцэптуальнасці і сэнсавай заглыбленасці яго пераўзыходзіць верш «Ружаны» Сяргея Амельчука:

Над горадам малым, шматвекавым,
З гісторыяй, касцёлам і царквамі,
Палац узнёсла панаваў між іншым,
Як і ўяўленне наша аб былым.
Але у мінулым надта горкі дым.
Меч звонкі быў заглушаны гарматай.
Разбураны палац... і,
што між іншым,
Як і ўяўленне наша аб былым.

Міраслаў Шайбак вядомы чытачу пакуль што выключна як аўтар хоку.

Слушна пісалася пра цесную сувязь японскага хоку як спецыфічна нацыянальнай формы з глебай, на якой яна вырасла — нацыянальным светаадчуваннем, з японскім пейзажам. Сапраўды, хоку — форма спецыфічная, але адмаўляць яе магчымасць для нашай паэзіі толькі з–за гэтага ўсё ж не варта: як паставіцца тады да працэсу ўзаемадзеяння і ўзаемапранікнення на сучасным этапе еўрапейскай і ўсходняй культур? Мы разважаем пра тое, магчыма ці немагчыма беларусу пісаць «японскія» вершы, а ў суседніх літаратурах падобнае пытанне даўно вырашана, і вось мы чытаем хоку югаслава Г. Пламена, а ў «Літаратуры і мастацтве» Алесь Разанаў пазнаёміў нас з хоку эстонскіх паэтаў.

Безумоўна, адарванае ад роднай глебы і, што галоўнае, пазбаўленае традыцыйна звыклага да яго ўспрымання чытача, хоку шмат што страціла. У М. Шайбака яно наблізілася фактычна да звычайнага верлібра, захаваўшы вонкава свае тры радкі і семнаццаць складоў, — значна спрацілася як знакавая сістэма, свядома ці падсвядома аўтар адмовіўся ад супастаўлення далёкіх паміж сабой асацыятыўных радоў і супастаўляе толькі паралельна–суседнія, што аблегчыла чытачу ўспрыманне, але зрабіла сам верш празмерна інфарматыўна–адкрытым:

Адкажы, сасна,
Колькі кветак пасохла
Побач з табою?..

Сасна ў гэтым вершы сімвалізуе даўгавечнасць, устойлівасць, кветкі — імгненнасць, хісткасць, але з дапамогай адналінейнага рытарычнага пытання аўтар робіць акцэнт на пэўнай эгацэнтрычнасці высокага і магутнага побач з слабым і безабаронным. Сярэднявечны японскі паэт выяўляў гэтую ідэю, безумоўна, інакш:

Ты стоишь нерушимо, сосна!
А сколько монахов отжило здесь,
Сколько вьюнков отцвело...
(Басё)

Як бачна, у класічным прыкладзе дакладнай акцэнтоўкі няма, думка абсалютна заглыблена, раствора ў трох вобразах, і вылучыць яе з тэксту значна цяжэй, бо тагачасным усходнім чытачом абстрактная думка не ўспрымалася ў адрыве ад канкрэтных, сутнасна–прадметных вобразаў і паняццяў.

«Паэзія — гэта прадчуванне думкі», — пісаў Міхаіл Прышвін. Але і думка, у сваю чаргу, — элемент паэзіі. У хоку М. Шайбака думка адвочна адыгрывае ролю першаэлемента, адсюль бяспрэчная мастацкая каштоўнасць тых вершаў, дзе гэтая думка жыццяздольная, глыбокая:

Ледзь дакрануўся
Да дзьмухавея, — адчуў
Вецер над полем.

Але адсюль жа і відавочная бездапаможнасць, інфармацыйная беднасць тых вершаў, дзе думка — банальная і дзе яе зусім няма:

Ад ветру з дажджом
Хаваю пад пахаю
Зборнічак вершаў.

Так, ніводная форма сама па сабе не ратуе ад няўдач і памылак.

Неяк нязвычна хутка і ўпэўнена, адразу і, ёсць падставы спадзявацца, надоўга ўвайшоў са сваімі вершамі ў кола чытацкай увагі Анатоль Сыс. Тым больш дзіўным магло здацца такое шпаркае ўваходжанне, калі ўлічыць, напрыклад, што тэматычна дэбютант года нічым не вылучаўся (Радзіма, маці, мова, гісторыя; зноў маці і зноў Радзіма):

— З чаго пачаць?..
Пачну з Радзімы.
Так абавязаны пачаць.
— Але ў яе ты не адзіны,
навошта пра любоў крычаць?

— Няхай, няхай я паўтаруся
ў любові тысячу разоў.
затое шчыра ў ёй клянуся,
без фальшу, без падробных слоў.
— Што ж, пачынай.
Сам выбраў долю...
Й нядоля знойдзецца сама.
Перад табою поле бою —
тут не адзін паэт сканаў.

Верш гэты, пабудаваны як унутраны дыялог, — відавочна праграмны, і не толькі для Анатоля Сыса. Сапраўды, усё амаль пачынаецца з Радзімы і амаль усе пачынаюць з яе ў сваёй творчасці, а ў нейкім плане і абавязаны так пачынаць. Але вось толькі к р ы ч а ц ь пра гэтую любоў не варта, і А. Сыс пра яе д у м а е, ён першапачаткова асэнсоўвае, што такое Радзіма і што такое любоў да яе; таму і не паўтараецца ён у шматгалоссі тых паэтаў, што клянуцца і шчыра клянуцца, а каму, чаму, для чаго і ў чым — не ўяўляюць, ніколі пра гэта не задумваліся.

Ёсць у вершах А. Сыса дастатковы ўзровень думкі і мера пачуцця, ёсць свая, адметная лексічная мова (трэба думаць, яна будзе з кожным годам узбагачацца),

ёсць спробы міфалагічнага канструявання рэчаіснасці, паэтычнае бачанне сусвету, плённая, але не празмерная заглыбленасць у фальклор і гісторыю, адчуванне спецыфікі паэтычнага пісьма.

Услед за Алегам Мінкіным малады паэт імкнецца спалучаць у сваіх творах патрыятычны пафас з адметнымі, часам авангарднымі формамі выяўлення, і, улічваючы яго самапатрабавальнасць і працу над удасканаленнем паэтычнай манеры, думаецца, што яго чакае на гэтым шляху плён.

Думаецца таксама, што і тэматычнае кола паэта, захаваўшы ранейшы эпіцэнтр, пашырыцца і разгорнецца. Але ўсё ж пра тое «поле бою», дзе «не адзін паэт сканаў», трэба помніць заўсёды, каб не згубіцца ні ў гісторыі, ні ў паэзіі.

Дарэчы, калі нябачная прысутнасць гісторыі ў большасці вершаў А. Сыса ўзмацняе іх унутраны змест, то вершы «спецыяльна–гістарычныя» нічым, акрамя патрыятычнага настрою, пакуль не вылучаюцца («Грунвальд», «Вячэра перад купаллем») і з мастацкага боку зусім бездапаможныя. Яны нагадваюць нейкія публіцыстычныя лозунгі, зарыфмаваныя і пакладзеныя на адзін з памераў дзеля «прыгожага» гучання і дзеля магчымасці выказацца на гэтую тэму ў друку. Празмерная патэтыка, бразгатанне мячамі, адсутнасць мастацкай глыбіні — характэрныя прыкметы такіх вершаў:

...Сканалі, ды ўсё ж не сталі —
помнілі, як Кастусь
ступіў на смяротныя шалі
з думаю пра Беларусь.

Большай, куды большай працы над словам патрабуе гістарычная тэма!

Вось і Кастусь Жук вырашыў упрыгожыць адзін са сваіх твораў «гістарычнымі галасамі». Сам па сабе верш «У вёсцы Вішнева» — не пра мінулае, але, паколькі дзеянне адбываецца ў вёсцы, дзе памёр Сымон Будны, квятастыя апісанні ўвішных рэчак і белых садоў зводзяцца ўрэшце да яго:

Вёска Вішнева. Рэчка ўвішная.
Белы вэлюм надзелі сады.
І над яблынямі, над вішнямі Дух буяе вясны маладды.

Тут утульна пчале і сонейку...
І дзявучыне з касой залатой...
Гэтак пахнуць галінкі соладка!
Гэтав хмеліць паветра настоі
А душа — то засне, то абудзіцца
На шчаслівай зямлі ў гэты міг...
Знерухомей — і голас Буднага
Ты пачуеш між дрэў шапаткіх.

Пакінем без каментарыяў мастацкі ўзровень верша, але задумаемся: што агульнага паміж пададзеным К. Жуком настраёва–вясновым малюнкам сённяшняга Вішнева і той змрочнай, фізічна цяжкай, па апісаннях езуіта Фрыбеліуса, абстаноўкай у доме пратэстанскага шляхціца Лявона Маклока, дзе ў студзені 1593 года скончыў свой жыццёвы шлях Сымон Будны? Адкуль гэты голас Буднага «між дрэў шапаткіх» і якім ён уяўляецца аўтару «на шчаслівай зямлі ў гэты міг» і «дзяўчыне з касой залатой»? Відаць, перш за ўсё ў аўтара ўзніклі «вішнёвыя» ідэі (Вішнева — увішныя — вішні), і Будны тут ні пры чым, з той жа верагоднасцю маглі мы пачуць і голас Скарыны, Каліноўскага, Багушэвіча.

...

У нашу паэзію акрамя сапраўдных паэтычных талентаў і яўных альбо прыхаваных графаманаў, акрамя будучых талентаў празаічных, драматургічных, крытычных (якія пачынаюць звычайна з паэзіі) усё больш прыходзіць юнакоў, якія захавалі ў сабе нейкім чынам любоў да нацыянальнай культуры і мовы альбо палюбілі яе пад уздзеяннем твораў Уладзіміра Караткевіча. Заканамерна, што любоў да Бацькаўшчыны, да гісторыі і будучыні роднага краю выяўляецца перш за ўсё ў паэзіі.

І ўсё ж павелічэнне колькасці маладых аўтараў, пры ранейшых рэдакцыйна–выдавецкіх магчымасцях і пэўным змяншэнні чытацкай аўдыторыі, уяўляецца не галоўнай праблемай маладой паэзіі. Куды больш непакоіць падабенства і сярэднеўзроўневая невыразнасць твораў большасці маладых і пачынаючых аўтараў, усеагульнае пакланенне і падпарадкаванне пануючым паэтычным канонам, нешматлікім нацыянальным стэрэатыпам, наследаванне нейкай агульнай традыцыі (кім? чыёй?) і невыразнасць альбо пэўная адсутнасць традыцый канкрэтных, на ўзроўні паэтычнай школы і блізкасці творчых манер. Мы ж паранейшаму не адрозніваем, па сутнасці, паэтычную традыцыю ад традыцыі духоўнай, і ў тым значэнні, у якім маладых паэтаў заклікаюць вучыцца ў Купалы, Коласа, Багдановіча, можна прапанаваць ім вучыцца ў Васіля Цяпінскага альбо Сяргея Палуяна. З усёй беларускай паэзіі, як ні дзіўна, толькі ў вершах Уладзіміра Жылкі знойдзем мы далейшае развіццё мастацкіх прынцыпаў Максіма Багдановіча, а ў сучаснай паэзіі іх уплыў адчуваецца хіба што ў кнізе Алега Мінкіна «Сурма».

Ёсць у маладых аўтараў адна цудоўная рыса: яны дазваляюць сябе крытыкаваць, што спрыяе творчаму самаўдасканаленню і хоць нейкаму адчуванню сваіх недахопаў і сапраўдных, рэальных магчымасцей.

Дэбютуюць Людміла Рублеўская і Уладзімір Сцяпан. Данута Бічэль–Загнетава піша так, што адчуваеш: гэта не чарговая нізка, а Твор. Уладзімір Мазго называе Надзею Дураву «беларускай амазонкай» і прысвячае ёй паэму. Валянціна Аколава піша пра Эмілію Плятэр, Уладзімір Арлоў — пра Усяслава Чарадзея. Паэты і празаікі заглыбляюцца ў гісторыю.

У мастацкай частцы з'яўляецца імя Георгія Станкевіча. Але мы больш ведаем яго як Юрыя Станкевіча, які хутка ўвойдзе ў склад рэдакцыі.

## 1988

Год прысвечаны мінуламу, і я неверагодна усхваляваная тым, якое гэта мінулае. Ідзе зварот да пачатку XX стагоддзя. Пісьменнікі спускаюцца па часе, нібы па прыступачках. Паўтараюцца, канешне, але знаходзяць і новыя постаці. І рэдакцыя знаходзіць новыя старыя імёны.

Досыць вялікая частка № 2 аддаецца пісьменнікам, якія пісалі калі не даўно, дык дакладна не сёння (А. Мрый), і пісьменнікам, якія не так даўно пашлі з жыцця (Алесь Бачыла, Аляксей Кулакоўскі, Уладзімір Караткевіч). Да твораў А. Мрыя Яўген Лецка піша прадмову: распавядае, навошта гэтыя тексты, напісаныя ў 1920–я, друкуюцца зараз. І навошта ж яны друкуюцца? А каб не страціць тое, што было ў часы «Маладняка» і «Узвышша», каб ведаць таго, хто амаль што не згадваўся з тых часоў, але згадкі варты.

Друкуецца шмат тых, каго ўжо цяжка назваць «моладдзю». Менавіта на гэта і скардзіцца Анатоль Сыс у анкеце, якая запісвалася з «Тутэйшымі». І яшчэ вельмі цікавая тэндэнцыя сярод старэйшых пісьменнікаў: пісаць пра сваю маладосць і яе сыход. Чытаючы такое, думаеш: Сыс мае рацыю. Часопіс — «Маладосць», а не «Насталыгія».

## Урыўкі з анкеты «Тутэйшых»

### Алесь Бяляцкі:

Узнікненне таварыства маладых літаратараў пры СП БССР «Тутэйшыя» натуральная і заканамерная з'ява. У апошні час, калі павысілася актыўнасць усяго грамадства, пытанні развіцця нашай культуры, самасвядомасці, мовы перастаюць быць прэрагатывай абраных і надзеленых уладай. Імклівы рост беларускага маладзёжнага руху, аб'яднанняў гісторыка–культурнага і краязнаўчага накірунку ў рэспубліцы тлумачаць тыя перадумовы, атмасферу грамадскага жыцця, у якой утварыліся і «Тутэйшыя». Творчая праца, вядома, справа індывідуальная, але ўсе мы апынуліся перад страшнай з'явай, якая замоўчвалася доўгія гады, — разбурэннем культуры нацыі, выцясненнем з ужытку і знікненнем беларускай, роднай для нас мовы. Вось тут для кожнага і паўстае пытанне — што рабіць далей? І аднаму адказаць на яго, а тым больш нешта змяніць вельмі цяжка.

Старэйшае пакаленне літаратараў (некалькі чалавек выключэнне) не выйшла са стану спакою. Як ні хочацца таму–сяму завуаляваць становішча сучаснай беларускай літаратуры ў цэлым, трэба паглядзець праўдзе ў вочы — яна ў заняпадзе. І паліцы кнігарняў, забітыя беларускімі кніжкамі, якія ніхто не купляе, — яскравы і аб'ектыўны паказальнік яе грамадзянскай каштоўнасці, яе сучаснасці. За паўшчырасць, за паўпраўду прыходзіцца плаціць, і не заўсёды тут дапамагае мастацкая якасць твора. Зноў жа, некалькім пісьменнікам (Быкаў, Адамчык, Разанаў і яшчэ) не па сілах апраўдаць існаванне цэлай сучаснай літаратуры. Ды не наша справа крытыкаваць. Нам трэба ўлічыць памылкі і не паўтарыць іх. Мы яшчэ неяк прабіліся да мовы, да літаратуры. А вось ці праб'ецца наступнае пакаленне?

Колькі шуму было з–за назову «Тутэйшыя». Ці не завельмі мы прызвычаіліся да «Сузор'яў» і «Крыніц»? Ды замгліліся нашы зоры і крыніцы зацягнула глеем. Я. Купала пісаў:

> Я не чыноўнік і не граф,
>     не князь,
> Таксама — я не турак і
>     не грэк
> І нават не паляк і
>     не маскаль,
> А проста я тутэйшы
>     чалавек!

А да Беларусаў нам трэба зноў і яшчэ дарастаць. Што гэта за нацыя, якая не шануе сваю мову, не гаворыць на ёй?

Пра мэты. Мяне асабіста хвалюе той факт, што некаторыя здольныя маладыя людзі пасля сутыкнення з абыякавасцю, з цяжкасцямі ў надрукаванні, прычым далёка не з–за творчых прычын, а тым больш з тэрмінам выпуску першага зборніка, адыходзяць ад творчасці ці замаруджваюцца. «Прабіванне» заўсёды прыніжае асобу, і не кожны на гэта здатны. Тут

Таварыства можа адыграць вялікую ролю ў падтрымцы і заахвочванні талентаў.

Ці не так даўно з маладых па адным вырываліся і «прылашчываліся» самыя «паслухмяныя»? Між тым як астатніх спрабавалі навучыць і «прычасаць». Наша мэта — стварыць нармальныя, вольныя ад кансерватыўных забабонаў умовы для развіцця маладой літаратуры, дзе на першым бы месцы стаяў талент аўтара, а не часовыя кан'юнктурныя меркаванні.

## Адам Глобус:

Таварыства пражыло год.

Ці пражыве яно яшчэ адзін год? Мы не ведаем, бо не ўяўляем, як можна было цэлы год вытрымліваць такую мітусню і калатэчу.

Фронда, нацюгі, банда, сіяністы антысеміты, хамы, блазны, варвары, вар'яты... Далёка не поўны спіс мянушак, налепленых на Таварыства, і ўсе абразы ішлі з азначэннямі накшталт: нявыхаваныя, бяздарныя, закамплексаваныя, нахабныя... Мянушкі і азначэнні дарылі нам пісьменнікі — старэйшыя таварышы і браты. А хто яшчэ іх мог нам падараваць? Чытач нас амаль не ведае.

Толькі мянушкі — не самае горшае, бо да іх пачалі яшчэ дадавацца плёткі.

— Валодзечка, а нашто вы са сцягамі, — колер сцягоў не ўдакладняўся, — каля Саюза пісьменнікаў ходзіце і ў дзверы нагамі стукаеце? — спыталася ў мяне выдатная сціплая паэтка.

Я аслупянеў, потым пераконваць пачаў, даводзіць, што не хадзілі мы са сцягамі і ў дзверы мы не грукалі. Пераконваў, пераконваў... Бачу, не верыць яна мне. Ну не, дык не.



*Людка СІЛЬНОВА, паэтка, нарадзілася ў 1957 г. у Маладзечна, скончыла філфак БДУ імя У. І. Леніна, бібліятэкар Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна.*



*Сяргей ШУПА, перакладчык, нарадзіўся ў 1961 г., скончыў Мінскі інстытут замежных моваў, працуе ў аддзеле крытыкі выдавецтва «Мастацкая літаратура».*



*Сяргей ДУБАВЕЦ, кр... тык, нарадзіўся ў 1959 у Мазыры, скончыў ж... фак БДУ імя У. І. Лен... на, літсупрацоўнік у ч... сопісе «Нёман».*

Аднаго разу сустракаю Уладзіміра Сцяпана, а ён мне замест «Дзень добры» ...кажа, што мы на сценах розную брыду пішам нітрафарбай з балончыкаў!

І гэтак далей...

Плётак столькі, што можна міфічную гісторыю Таварыства маладых літаратараў пры СП БССР выдаваць. Толькі мы вырашылі пачакаць з выданнем «гісторыі», бо верым, што людзі, якія абражаюць нас, пакінуць свой (разумею, што спакусліві) занятак. Мы ведаем тых, хто называе нас «фрондаю» і «нацюгамі», тых, хто стаіць за псеўданімам «наш кар.», тых, хто прапаноўвае выгнаць Таварыства з Дома літаратара. Мы ведаем і маўчым.

У Таварыства маладых літаратараў і Саюза пісьменнікаў адносіны цудоўныя, калі не лічыць таго, што ўсе гэтыя адносіны ніводным дакументам не замацаваны.

Ёсць жаданне пражыць яшчэ адзін год.

А там паглядзім...

## Анатоль Сыс:

Вечная праблема бацькоў і дзяцей (менавіта так я разумею пытанне). Гэтая праблема была, ёсць і будзе ва ўсе часы і ва ўсіх літаратурах свету. Я вырашыў не паўтарацца, таму і даю слова (у маім перакладзе) пакуль болыл славутым і прызнаным, чым мы, папярэднікам.

*(Ад рэдакцыі: далей Анатоль Сыс цытуе розныя літаратурныя крыніцы ва ўласным перакладзе. Вельмі постмадэрнісцкі адказ).*

## Людка Сільнова:

...Студэнты, навучэнцы ПТВ, маладыя рабочыя, якія толькі спрабуюць сябе ў літаратурнай творчасці, часам яшчэ цішком ад усіх, і акуратна ходзяць да нас на кожнае пасяджэнне, — гэта «сябры», неправадзейныя члены нашага таварыства. Бываюць у нас яшчэ і проста «госці»; маладыя гісторыкі, філосафы, мастакі, выкладчыкі ВНУ і іншыя, а таксама прыезджыя. Мне часам здаецца, сама расстаноўка мэблі ў пакоі для нашых пасяджэнняў: авальны стол пасярэдзіне з крэсламі вакол яго і шматлікія крэслы ўздоўж усіх чатырох сцен — «гістарычна» спрыяла ўзнікненню менавіта такой формы нашай арганізацыі...

Цяпер канкрэтна, што дае нам, як маладым творцам, нашае аб'яднанне. Гэта — магчымасць узважыць свае літаратурныя здольнасці (можа, гэта ўсё — «узроставае»,



*Алесь БЯЛЯЦКІ, старшыня таварыства, крытык, нарадзіўся ў 1962 г., скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага універсітэта; аспірант Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР.*



*Адам ГЛОБУС, паэт і празаік, нарадзіўся ў 1958 г. у Дзяржынску, скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (мастацкі факультэт), працуе ў часопісе «Крыніца».*



*Анатоль СЫС, паэт, нарадзіўся ў в. Гарошкаў Рэчыцкага раёна ў 1959 г. Скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт (гісторыка-філалагічны факультэт). Працуе на Беларускім тэлебачанні.*

звычайная юнацкая ўзрушанасць, якая з цягам часу — які сорам — пройдзе...), больш крытычна аднесціся да свайго літаратурнага «прадукта», а таксама ацаніць агульны ўзровень сваёй прафесійнай пад-рыхтоўкі. Традыцыйныя ў нас абмеркаванні творчасці маладых аўтараў праходзяць у даволі жорсткай форме, і прысутнымі звычайна прад'яўляюцца да аўтара вельмі высокія патрабаванні! (З аднаго боку — гэта добра, але шкада, што часта нам не стае звычайнай чалавечай добразычлівасці; і толькі ў канцы — як быццам зды-маюцца «маскі»: «Ну, што, не спужаўся? Будзеш пісаць?..»)

Важна таксама, што таварыства мае магчымасць даць сваім членам, маладым аўтарам, слухачоў і чытачоў — ад невялічкай мітынгавай пляцоўкі да вялікай канцэртнай сцэны і часткі газетнай ці часопіснай плошчы: «Скажы, калі табе ёсць што сказаць...» Вось тут і ідзе вялікі «натуральны адбор», дакладней — самаадбор; часцяком драматычны, але бяскрыўдны... Не будзеш жа крыўдзіцца на самога сябе?

Хачу дадаць, што наша «сістэма», як зараз пішуць пра маладзёжныя арганізацыі нефармалаў, — гэта не «кашуля, якую шылі навырост» (і якую звычайна прапаноўваюць маладым аўтарам у літаб'яднаннях пры газетах — разам з адносінамі да іх як да малых дзяцей), а тыя часовыя, штучныя «апранахі», якія ўжо, мне здаецца, асэнсоўваюцца тым жа А. Сысам як «сіло для крыл маіх»!

...Літаратура — гэта працэс. Жывы, як само жыццё, якое літаратура адлюстроўвае (вядомая, яшчэ са школьных гадоў, метафара). І таму ўзнікненне нашага, і менавіта такога — шматузроўневага літаратурнага аб'яднання («паскаральніка»), я лічу гістарычна абумоўленым: паскарэнне ў жыцці — паскарэнне ў літаратуры!.. Што вый-дзе з нас праз 3—5 гадоў? Хто ведае, як працуе сапраўдны паскаральнік, хай задумаецца...

А літаратура — гэта не толькі люстэрка, але і Залюстэркаўе, самакаштоўны свет, у якім я адчуваю сябе кэралаўскай Алісай...

## Сяргей Шупа:

Караткевічава Слова зрабіла найбольшы, вырашальны ўплыў на фармаванне маёй грамадзянскай і творчай пазіцыі. Адбылося гэта, відаць, таму, што шал нацыянальнага нігілізму на пераломе 70–80–х гадоў дасягнуў такой ступені, што стыхійна і аб'ектыўна пачаў спараджаць сваю процілегласць — патрыятызм, цягу да беларушчыны. У моры трыбуннае хлусні, грубага матэрыялізму і прагматызму творчасць Караткевіча сталася збаўчай выспай шчырасці, чысціні, рамантычнасці і, галоўнае, — гаючай крыніцай нацыянальна–гістарычнай свядомасці.

Найлепшым, адзіным у беларускай літаратуры творам сусветнай значнасці лічу раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Далей — творы, што ўвайшлі ў зборнік «З вякоў мінулых», «Зямля пад белымі крыламі», вершы.

Для мяне, як і для іншых «дзяцей асфальту», шлях да нашай класікі быў нялёгкі. Як цяжка было зняць з Купалы лапці і сярмягу, уздзетыя на яго школай і іншымі «руплiўцамі» на ніве «беларускай культуры». І як таемна–радасна было адкрываць для сябе слова Купалы, тое, якое мінаў раней без асаблівай увагі, і тое, што з пільнасці тых самых «руплiўцаў» апынулася па–за межамі 7–тамовага збору твораў.

Падобнае адбывалася і з Багдановічам, хоць ён і паўставаў са старонак школьнай хрэстаматыі больш «прэзентабельна». Але ж не было ў той хрэстаматыі «Пагоні» — найяскравейшага ўзору грамадзянскай паэзіі ў нашай літаратуры, які, нягледзячы на спробы дэмагогаў знайсці «небяспечныя» асацыяцыі, алюзіі, гістарычныя паралелі, будзе паўсюль і заўсёды ўспрымацца як



*Язэп ЯНУШКЕВІЧ, літаратуразнаўца, нарадзіўся ў 1959 г. у м. Ракаў Валожынскага р-на, скончыў філфак БДУ, абараніў кандыдацкую дысертацыю па творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР.*



*Уладзімір СІЎЧЫКАЎ, паэт, перакладчык, нарадзіўся ў 1958 г. у Жодзіна, скончыў філфак БДУ імя У. І. Леніна, працуе ў часопісе «Бярозка».*



*Сяргей КАВАЛЕЎ, крытык, нарадзіўся ў 1963 г. у Магілёве, скончыў філфак БДУ імя У. І. Леніна, аспірант кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна.*

шчыры патрыятычны верш, верш–гімн.

Іншым нашым пісьменнікам, як напрыклад Гарэцкаму, пашанцавала яшчэ меней — у школе пра іх не казалі ні слова, і таму даводзілася адкрываць нанова і «Дзве душы», і аповесці, і апавяданні гэтага нашага ці не найлепшага навеліста.

Надта ж блізкія і сугучныя мне дух і ідэі літаратурнага згуртавання «Узвышша», шчыміць сэрца, калі гартаеш старонкі выдаванага ўзвышэнцамі часопіса, да болю шкада, што такі нядоўгі век быў яму наканаваны.

Вярнуўшыся ў нашы дні, найперш трэба адзначыць творчасць Алеся Ра-занава, паэта, які, захоўваючы ў сваёй творчасці глыбока нацыянальныя архетыпы, адчыніў брамы, у якія да яго мала хто з нашых літаратараў наважваўся нават пагрукаць. Ён вядзе нас і ўнутр сябе, і вонкі, пашыраючы пры гэтым Сусвет беларускага Слова.

## Сяргей Дубавец:

Калі быць самакрытычнымі, дык гадаваламу дзіцяці, напэўна, не падабаецца, што яно ходзіць у порткі. Не падабаецца — вось і ўся самакрытыка. Бо вінавацься тут, не вінавацься — сам рады не дасі. Будзеш кугікаць, пакуль мамка не прыйдзе. А яна — ці то нарадзіла, не нагуляўшыся, ці то самой ужо патрэбны гаршчок?..

Калі быць самакрытычнымі, дык не падабаецца тое, што «Тутэйшыя» ад пачатку прыляпіліся да СП. Янус двухаблічны, і лёгка зблытаць, дзе Літаратура і таленты, а дзе апарат і апаратаўцы. Лёгка прыгрэцца ва ўтульных памяшканнях, прыгнуцца пад ласкавай рукою апекі, лёгка ўбачыць «перспектыву», пайсці на кампраміс... Адно трэба ўлічваць, што «Тутэйшыя» — не палітычная партыя, і кампрамісы для іх — самае апошняе, неадольнае выпрабаванне.

Між тым, каля пісьменніцкіх размеркавальнікаў — сам бачыў — сноўдае цётка Распуста, і я не веру, каб хоць адзін «тутэйшы» ані разу не зірнуў на ейныя вабноты. А «кожны, хто з пажадай пазірае на жанчыну, ужо чужаложыў з ёю ў сэрцы сваім». Каму ж ён аддасць сваё сэрца: Літаратуры ці — апарату?..

Нарэшце, калі быць самакрытычным, дык не падабаецца працяглы нонсэнс нашых пасяджэнняў, дзе чытаюць і абмяр-коўваюць неравважна не тое, што мусіць змяніць свет, а тое, што напісалася дзеля пасяджэння, дзеля публікацыі, паводле прынятых застойных устояў. У гэткіх чытках ва ўтулку Дома літаратара блякне сам сэнс існавання «Тутэйшых». Лепей — творчая групаўшчына і канфрантацыя, чым прытулак для інвалідаў, між якімі таксама непазбежная групаўшчына і канфрантацыя, толькі не шчырая, а помслівая, за вочы, хваравітая.

Каб быць самакрытычнымі, трэба быць самастойнымі. Якая самакрытыка ў немаўляці...

## Язэп Янушкевіч:

Сябрамі Таварыства маладых літаратараў падрыхтаваны або рыхтуюцца да выдання спадчына Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча, Яна Баршчэўскага, Францішка Багушэвіча, Кастуся Каліноўскага, Міхаіла Карыцкага, Ігната Канчэўскага, Анталогія старажытнай беларускай паэзіі. Гэта — з мінулага. З сучаснай беларус-кай літаратуры — спадчына Анатоля Сербантовіча, ранняя проза і дзённікі Уладзіміра Караткевіча. Пералічаныя імёны, спадзяюся, акрэслілі абрысы мацерыка, на якім мы стаім. Ён вялікі і трывалы.

Трываласць яго закладвалася не сёння і не ўчора. Гісторыя распарадзілася так, што бегам апошніх стагоддзяў у беларускае прыгожае пісьменства прыходзілі адно людзі годныя, свядомыя, адданыя справе адраджэння і развіцця роднай літаратуры. Іншым тут і рабіць не было чаго. Бо замест рэальнага ганарара літаратарам выплачвалі яго чэкамі з подпісамі:

«рэкрут» (П. Багрыму, Ф. Савічу), «правінцыйны вершаплёт і хлапаман» (В. Дуніну–Марцінкевічу), «катаржнік» (А. Вярыгу–Дарэўскаму), «выгнаннік» (Ф. Багушэвічу), «несостоятельный должник и умопомешанный» (А. Абуховічу). Таму генетычны фонд роднай літаратуры хоць марудна, аднак паслядоўна папаўняўся адно мужыцкай, народнай праўдай самай вышэйшай пробы.

Наша ж эпоха, асабліва тыя дзесяцігоддзі, якія цяпер называюць «застойнымі», дазволіла развівацца ў невядомых раней для беларускай літаратуры памерах прыстасавальніцтву, падхалімажу, пратэктарству, запалоханасці аўтара «ўнутраным» і «знешнім» рэдактарам, каб не апынуцца ў непажаданых «кліматычных умовах» (геаграфічна і палітычна), спарадзілі сумна вядомае: «На мой век і сямейны хлеб беларускай мовы хопіць». Тым самым пачаўся працэс раскрадання, падмену духоўных скарбаў нацыі, скарбаў, якія на працягу нялёгкіх стагоддзяў назапашвалі папярэднікі Купалы, Коласа, Цёткі, Багдановіча, Гарэцкага, Чорнага, Мележа. Дык хіба можна ўспрымаць такое бесстаронне? Адсюль і адмаўленне; з усведамлення, што «будзе не так, як гісторыя захоча, а як мы зробім». Бо гісторыя — гэта Час і Людзі.

## Уладзімір Сіўчыкаў:

Факт выдання першай ці нават чарговай кнігі далёка не заўсёды сведчыць пра творчую эвалюцыю яе аўтара. Выхад кнігі — пастфактум. Яна гаворыць пра творцу, якім ён быў пяць гадоў таму. Такая сярэднеарыфметычная адлегласць паміж рукапісам і з'яўленнем нават танюткай кніжачкі на паліцах кнігарняў. Праўда, для народнага пісьменніка, лаўрэата, пераможцы конкурсу, дырэктара выдавецтва яна можа быць меншая. Нярэдка і ў рэдакцыях газет і часопісаў рукапісы ляжаць па некалькі гадоў. Таму аўтар, асабліва малады, нярэдка «перагарае» і не мае вялікай радасці, калі нарэшце атрымае сігнальны экземпляр.

Што ж тычыць удзельнікаў Таварыства (я знарок скрозь ужываю слова «Таварыства», бо, як і некаторыя іншыя члены аб'яднання, не згодны з найменнем «Тутэйшыя», нягледзячы на тое, што яно і прыжылося), то яны не збіраюцца ні ўтвараць кааператыўнае выдавецтва, ні займацца самвыдатам, ні, тым больш, друкавацца за акіянам.

## Сяргей Кавалёў:

Якімі мы будзем праз дзесяць–дваццаць гадоў і як тагачасныя маладыя літаратары будуць нас адмаўляць і не прымаць?

Уявіць, якія мы будзем «ідэальна шчырыя і бездакорныя» — няцяжка, але з гэтага і пачалася б, відаць, няшчырасць. Няма надзейных рэцэптаў для таго, каб у жыцці і творчасці заўсёды заставацца маладым, пазбегнуць праяў кансерватызму, заспакоенасці, пасля шматлікіх кампрамісаў з сумленнем захаваць павагу і аўтарытэт у бескампраміснай і катэгарычнай моладзі. Працэс сталення і пераходу з ранга тых, хто адмаўляе, у ранг тых, каго адмаўляюць, — з'ява не толькі ўзроставая, але і псіхалагічная. Лёгка звыкнуцца з думкай, што ўсё новае, начаканае, дзёрзкае — у творах тваіх равеснікаў і назаўсёды застанецца менавіта ў іх, назаўсёды застанецца «самым–самым», а «юніёры» наступнага пакалення хоць і здольныя, таленавітыя, але яны яшчэ толькі падаюць надзеі, іх творы — нешта цікавае, арыгінальнае, але пакуль яшчэ недастаткова сур'ёзнае, створанае ў іншай вагавай катэгорыі. Не дзіўна, што калі ў паэта ці празаіка выходзіць выдатная першая кніга, пра яе гавораць і пішуць не як пра выдатную кнігу, але як пра выдатную першую кнігу.

Іерархія ўзростаў, заслуг, пасад і званняў дазваляе масцітым пісьменнікам трымацца ад літаратурных вопытаў маладых на дастатковай адлегласці, нават паблажліва пахвальваць таго–сяго — усё роўна ж іншая катэгорыя.

Іншыя праблемы. Пачатковец з хваляваннем чакае сваёй першай публікацыі ў часопісе, чакае звычайна некалькі гадоў; для яго такая публікацыя робіцца ці не галоўнай падзеяй жыцця за гэтыя гады. Прызнаны майстар, заклапочаны выданнем свайго выбранага ў Маскве і двух– ці трохтомніка ў Мінску, аддае мімаходзь чарговую падборку вершаў ці новы раман у часопіс і выказвае сваё важкае пажаданне «не зацягваць з публікацыяй».

Спадзяюся, што праз дзесяць–дваццаць гадоў непрыманне і адмаўленне нас маладзейшымі таварышамі будзе выяўляцца як непрыманне нашай творчай манеры, нашых мастацкіх перакананняў і прыхільнасцей, але не якаснага ўзроўню нашых твораў, не нашых этычных прынцыпаў у жыцці і творчасці. Спадзяюся, што не дадзім падстаў для абвінавачвання нас у празмерным выдаванні, якое проста недаравальнае пры сучасных анамальных адносінах беларускай літаратуры з чытачом.

І яшчэ адно спадзяванне, яшчэ адна фантазія на тэму адмаўлення.

На пісьменніцкіх з'ездах, секцыях, сходах паважныя літаратары, а то і кіраўнікі СП слушна папракаюць выдавецтвы за недастатковую ўвагу да маладых аўтараў. Супрацоўнікі выдавецтва скептычна выслухоўваюць такіх прамоўцаў, бо памятаюць



Ілюстрацыя з № 4 за 1989 г.

выпадкі, калі назаўтра пасля сваіх выступленняў яны прыносілі ў выдавецтва заяўку на сваю чарговую кнігу («пажадана як мага хутчэй уключыць у план»), «Не знойдзецца ў нас ніводнага «пакутніка» за маладых, хто б замест гучных слоў адмовіўся б на карысць пачынаючых аўтараў хаця б ад адной сваёй кнігі выбранага, ад аднаго чарговага перавыдання. Не верце, хлопцы, дабрадзеям, ой не верце!» Не верым, як, зрэшты, не верым і ў тое, што, калі б такі філантроп знайшоўся, вызваленыя аркушы, тыраж і пазіцыю выдавецтва аддало б «хлопцам». Хутчэй за ўсё яны дасталіся б іншаму дабрадзею.

І ўсё ж. Гляджу ў кнігарні на шматлікія двухтомнікі і шматтомнікі (ходзяць легенды, што на некаторыя з іх падпісалася па ўсёй Беларусі пяць–дзесяць чалавек) і думаю, што толькі аднаго з іх хапіла б на тое, каб зняць праблему выдання першых кніг паэтаў і празаікаў на дзесяць гадоў наперад. І мару пра тое, каб праз дваццаць гадоў мне альбо каму іншаму з нашага Таварыства прапанавалі выдаць кнігу выбраных твораў. Можа, неверагоднае ўсё ж такі магчыма, нехта з нас знойдзе ў сабе сілы адмовіцца ад гэтай кнігі на карысць тагачасных маладых творцаў і праблема адмаўлення будзе ўрэшце вырашана?

Людміла Рублеўская класічна звяртаецца да вобраза Еўфрасінні, надаючы ёй сучаснае гучанне («Балада аб жаночай волі»), піша пра скіфаў, згадвае Шляхціца Завальню і заснавальнікаў беларускага тэатра. Яе вершы гучаць так, што ты дакладна ведаеш: у паэткі гэта баліць. І ў цябе, чытач, праз тое будзе балець і Еўфрасіння, і тэатр. І таксама тут з'яўляюцца вельмі значныя радкі: «ад бронзы – як ад забыцця – / Ратуй сваіх сыноў, Радзіма!» Калі даяце асобам сыходзіць ў вечнасць, калі ласка, дазваляйце ім заставацца людзьмі, а не помнікамі самім сабе.

Хочацца прыгадаць — і прыгадваю — Карласа Шэрмана, які ўжо друкаваўся ў «Маладосці», але зараз ён так трапляе ў сугучча, дзе шмат галасоў кажуць пра любоў да зямлі не збітымі словамі, праз гісторыю і гонар. І ён прысвячае адзін верш Міхасю Стральцову, які памёр у 1987 годзе.

Сучасныя тэмы і сучасныя формы з'яўляюцца таксама. Адам Глобус піша пра меліярацыю, пра якую ў той час не вельмі дазвалялася гаварыць. Сяргей Кавалёў друкуе свае казкі, якія праз вобраз гавораць і пра гісторыю, і пра сучаснасць. Калі бачыш яго творы, хочацца радавацца, бо на старонках з'яўляецца штосьці па–за сацрэалізмам. Вельмі добра дэбютуе ў «Маладосці» Юрась Пацюпа, не звяртаючыся ў сваіх вершах да зацяганых слоў. Першы раз у «Маладосці» з'яўляецца Ігар Бабкоў, які ў 2013–м возьме прэмію Гедройца.

І праз што адметным становіцца гэты год? Праз дзве вялікія працы — гістарычныя нарысы Міколы Ермаловіча («Старажытная Беларусь») і шэраг матэрыялаў, прысвечаных беларускай эміграцыі («Беларуская эміграцыя: факты і меркаванні»), падрыхтаваныя Барысам Сачанкам. І сюды ж вельмі добра кладзецца адзін верш з нізкі Людмілы Рублеўскай, прысвечаны «беларусам, памерлым на чужыне».

У гэты ж час пачала выходзіць «Бібліятэка часопіса "Маладосць"» — кожны год будзе выходзіць дванаццаць кніжак маладых пісьменнікаў і пісьменніц, публіцыстаў і публіцыстак.

## З кнігі «Скрозь «Маладосць»...»

Перабудова нібы рухалася наперад, але ў нас вялася літаральна вайна супраць розных «нефармалаў» — асабліва тых, хто падаваў голас у Беларусі за... адраджэнне беларускай мовы і культуры. Нават у Маскве празвалі нашу рэспубліку Вандэяй. Найбольш свядомая наша інтэлігенцыя на чале з Быкавым мусіла звярнуцца да самога Гарбачова з просьбай дапамагчы прадухіліць знішчэнне беларускай нацыі і вызначыць захады на адраджэнне. Копію гэтага звароту пераслалі ў наш ЦК, а там ідэолаг–сталініст, празваны ў прастамоўі Саўка, выклікаў амаль усіх падпісантаў у свой кабінет і літаральна душыў за горла: адмоўся ад свайго подпісу, а то!.. Ніхто не адрокся. У ЦК КПСС на сакратарыяце на чале з Я. Лігачовым абмеркавалі гэты зварот і з некалькіх дзесяткаў яго пунктаў з грыфам «Секретно» прынялі адчэпнае: дазволілі пры «Маладосці» выдаваць штомесячна «Бібліятэку». Во была самастойнасць БССР: нават такое невялічкае выданне трэба было выпрошваць у цэнтры!

Маладым — радасць: па 5 кніжачак паэзіі і прозы, па 1–ой — публіцыстыкі і крытыкі штогод! Але штату, акладаў на гэта не выдзелілі, толькі невялікі ганарар для аўтараў, таму ў калектыве ледзь не бунт машыністкі, карэктара, тэхрэда, мастацкага рэдактара: для іх працы пабольшала, а вось аклад — не. Грачанікаў, папрасіўшы Шамякіна ў заступнікі, мусіў ісці з чалабітнай у ЦК, там скрыгаталі зубамі за той зварот і нічога не далі, толькі дазволілі ўдзельным ў выпуску нумара «Бібліятэкі часопіса "Маладосць"» тое–сёе адшчыкваць з аўтарскага ганарару, што ён са згоды суўладальнікаў і аформіў загадам па рэдакцыі. З 1988 года справа пайшла ў ход. Першыя свае кнігі ў гэтай серыі выдалі А. Сыс, А. Федарэнка, А. Наварыч, А. Казлоў, Г. Багданава, М. Скобла і шмат іншых — і адразу станавіліся членамі Саюза пісьменнікаў.

*Генрых Далідовіч*

Сумнае: пайшла з жыцця Яўгенія Янішчыц. У мяне няма слоў, каб напісаць пра гэта нязбіта. Таму я проста развітаюся з ёй моўчкі.

Гэты год быў прысвечаны таму, што было раней. І гэта была не вайна. Дзякуй усім, хто датычны да тых нумароў: вы дазволілі адчуць гісторыю ў сучаснасці. Адбалець унутры — ёю.

## 1989

Апошні год майго часопіснага дзесяцігоддзя дае новыя тэмы, дапамагае закрычаць на ўсю моц лёгкіх тым, хто прыйшоў у літаратуру за апошнія два гады, і спрыяе з'яўленню вялікай колькасці новых імёнаў.

Але за тым, як гэтыя імёны будуць гучаць далей, сачыць ужо не мне.

Аўтары крыху (ці часам — значна) маладзеюць, на старонках з'яўляецца шмат імёнаў, адбываюцца дэбюты, якіх істотна болей, чым у папярэднія гады. Ці год такі, ці часопіс так адрэагаваў — але мы бачым новых аўтараў. Можна знайсці крытычны артыкул Ганны Кісліцынай — дваццацідвухгадовай Ганны Кісліцынай.

У крытыцы адбыліся досыць значныя, на маю думку, змены. Раней можна было прачытаць агляд паэзіі і агляд прозы за папярэдні год. Зараз друкуецца адзін агульны артыкул — «Маладая беларуская літаратура» і з'яўляецца новы фармат асэнсавання папярэдняга літаратурнага года — анкета, дзе можна знайсці больш трактовак сучаснага літаратурнага стану.

— Калегі, у вас «Анкеты Маладосці» былі? — пытаю быццам ва ўсіх, але 1990–я хварэюць, 1960–я і 2000–я, быццам згаварыліся, у іншым будынку, а 1970–я працуюць у іншым пакоі. Побач толькі адвечныя 1950–я.

— Былі. Але там пытанняў не было. Усе толькі выказвалі сваё дазволенае меркаванне, — адказваюць адвечныя 1950–я.

«Маладосць» заўсёды паважае традыцыі, але яе нельга назваць кансерватыўнай. Цяжка штосьці надрукаваць? А мы возьмемся, надрукуем, прапрацаваўшы вялізарную схему падтрымкі твора.

Так было з «Мячом князя Вячкі», пасля якога выходзіць навуковы артыкул М. Ермаловіча. Вельмі спрэчным падаўся чытачу артыкул Барыса Сачанкі пра беларускую эміграцыю — у часопісе друкуюцца лісты, на якія рэдакцыя і аўтары адказваюць. Лістамі адрэагавалі і на артыкул, прысвечаны заняпаду беларускай мовы. Дагэтуль тэма мовы гучала ў вершах, але ніхто не казаў пра яе «заняпаласць». Не дазваляў сабе.

Варта згадаць і «Старонкі з будучай кнігі–эсэ пра Уладзіміра Караткевіча» Адама Мальдзіса. Можна адчуць, як змяняецца час. Раней можна было прачытаць шмат празаічных партрэтаў працаўнікоў, на якіх я не спынялася. Гэта адпавядала часу, таму існавала і выглядала арганічна. Але што мы бачым зараз? Яны амаль зніклі і іх з'яўленне выглядае ледзь не анахранізмам. Іх месца займаюць сітуацыйныя замалёўкі: пісьменнікі спрабуюць ухапіць, як змяняецца час. Але паспяваюць штосьці ўхапіць і запісаць у форме апавядання Таіса Бондар і Уладзімір Бельскі, каб адчуць, што ўжо амаль 1990–я.

І яшчэ два імя, на якіх я хачу развітацца з гэтым годам: Яўгенія Янішчыц і Лукаш Калюга. Яго прозу друкуюць, а ёй прысвячаюць вершы.

***

Я трымала ў руках усе гэтыя часопісы — колькі стосаў з 1980–х. Глядзела на прозвішчы аўтараў, чытала іх творы, чытала пра іх. Чым стала для мяне «Маладосць» 1980–х? Гэта гісторыя людзей, якія сталі сям'ёй. «Маладосць» 1980–х – гэта каманда Анатоля Грачанікава. Хтосьці прыйшоў у рэдакцыю пры ім, хтосьці, як Валянцін Ждановіч, працаваў і раней. Але для мяне гэта ўсё роўна «яго» каманда. Пры іх у літаратуру прыйшлі «Тутэйшыя», Святлана Алексіевіч, сучасныя выдаўцы і многа хто яшчэ.

«Маладосць» 1980–х — гэта пражыты час, які я не жыла.

«Маладосць» – гэта гісторыя болю і эйфарычнага шчасця. Ніхто нідзе не кажа гэтага слова, але я хачу, каб гэта гучала, таму што гэта трэба агучваць, каб яго было менш, — «самагубства».

Я трымала гэтыя часопісы дрыготкімі рукамі, таму што гэта была гісторыя болю для ўсёй іх сям'і — іх рэдакцыі, якая, напэўна, сапраўды так жа з дрыготкай трымала гэтыя часопісы і плакала агульным рэдакцыйным целам.

Гэта была гісторыя маленькіх і вялікіх перамог, калі атрымлівалася надрукаваць тое, што друкаваць было нельга.

Тады рэдакцыя падпісвалася «Маладосцеўцы». Пазней — «рэдакцыя часопіса «Маладосць». Цяпер наш подпіс — «М»ы.

Дзякуй усім гэтым складнікам, што былі са мной і маімі 1980–мі.